ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# ПАЎНОЧНЫ ВЕКТАР: УЗАЕМАДЗЕЯННЕ СУЧАСНАГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ І МАСТАЦТВА КРАІН БАЛТЫЙСКАГА РЭГІЁНА

ПАВЕЛ ВАЙНІЦКІ

***Анатацыя:*** На матэрыяле сумесных выстаў, праектаў і іншых камунікацыйных падзей другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя разглядаюцца прыклады творчага ўзаемадзеяння беларускай мастацкай супольнасці з калегамі краін Балтыйскага рэгіёна. У выніку даследавання выяўляюцца асноўныя элементы ўзаемаўплыву сучаснага мастацтва Беларусі і краін Балтыі.

***Ключавыя словы:*** сучаснае мастацтва, міжкультурнае ўзаемадзеянне, мастацтва Беларусі, мастацтва краін Балтыйскага рэгіёна.

# THE NORTHERN VECTOR: INTERACTION BETWEEN BELARUSIAN CONTEMPORARY ART AND THE ART OF THE BALTIC SEA REGION

***Abstract:*** On the materials of group exhibitions, projects, and other communicational events, which took place in the late 20$^{th}$ – early 21$^{st}$ centuries, the paper presents the main examples of creative interaction between the Belarusian art community and its colleagues from the Baltic Sea Region. The research analyzes the basic elements of the mutual influence of contemporary art of Belarus and that of the Baltic countries.

***Keywords:*** Contemporary Art, Intercultural Communication, Belarusian Art, Art of the Baltic Sea Region.

Дзякуючы геаграфічнай блізкасці і перапляценню гістарычных наратываў культурныя сувязі беларускага і Балтыйскага рэгіёнаў маюць шматвяковую гісторыю, на працягу якой яны вар'ююцца ў напрамках і інтэнсіўнасці, зазнаўшы перыяды росквіту і заняпаду. У другой палове XX стагоддзя міжкультурнае ўзаемадзеянне па паўночным вектары чарговы раз інтэнсіфікуецца.

Кантакты паміж творцамі двух рэгіёнаў робяцца асабліва актыўнымі ў межах познесавецкай культурнай прасторы. Дамы творчасці Саюза мастакоў СССР, Усесаюзныя маладзёжныя выставы і канферэнцыі давалі шырокія магчымасці для артыстычных стасункаў і ўзаемапранікнення нацыянальных мастацкіх тэндэнцый.

Цікава, што "новыя павевы" часта пранікалі ў беларускае савецкае мастацтва менавіта з Балтыйскіх рэспублік, дзе да так званага "мадэрнізму" ставіліся больш лаяльна. Так, натхняльным прыкладам для беларускіх абстракцыяністаў былі не апальныя К. Малевіч, В. Кандзінскі, М. Ротка, а літоўскі мастак М. К. Чурлёніс, чыя спадчына ў савецкім мастацкім дыскурсе была легітымізавана.

З 1970-х – 1980-х гадоў у беларускай скульптуры ідуць працэсы асваення новых прынцыпаў формаўтварэння. Ва ўмовах пэўнай культурнай замкнёнасці ў межах СССР беларускія скульптары маглі знаёміцца з новымі, не-сацрэалістычнымі, творчымі метадамі апасродкавана – у асноўным, зноў жа, праз працы калег з прыбалтыйскіх рэспублік. Для айчыннай скульптуры 1980-х гадоў характэрна выкарыстанне пластычных цытат з творчасці літоўскіх аўтараў А. Кузьмы, Л. Жукліса, Я. Мазурайтэ-Клямкенэ. Асобныя прыёмы абагульнення пры працы з каменем запазычваліся беларускімі аўтарамі ў латвійскіх творцаў М. Ланге, М. Скулме і іншых. У такіх наватарскіх беларускіх аўтараў 1980-х гадоў, як У. Слабодчыкаў, У. Панцялееў, Г. Гаравая, адзначаюцца ідэнтычныя прыбалтыйскім стратэгіі фармальнай інтэрпрэтацыі аб'ёмаў і іх узаемадзеяння з прасторай. Існаваў нават цэхавы іранічны тэрмін "кузміць", які ўжываўся да беларускіх скульптараў, якія занадта яўна пераймалі стылістыку А. Кузмы.[1]

З распадам СССР творчыя кантакты мінімалізаваліся, але не перапыніліся. Пленэры, сімпозіумы, сумесныя выставы і іншыя гасцявыя выезды мастакоў у суседнія краіны – такая спецыфіка міжкультурнага мастацкага ўзаемадзеяння беларускіх і балтыйскіх аўтараў 1990-х гадоў. Цікава, што падчас разбурэння інстытуцыянальных і "дарослых" мастакоўскіх сувязей, сталі дамінаваць кантакты на маладзёж-

[1] Па ўспамінах мастацтвазнаўцы, дырэктара Музея сучаснай беларускай скульптуры імя А. Бембеля, Ларысы Дабравольскай (Дабравольская, 16 кастрычніка 2001, асабістая размова).

ным узроўні. Сярод важных падзей гэтага перыяду з удзелам творчай моладзі варта адзначыць Міжнародны фотапроект маладых фатографаў Беларусі і Латвіі "Рукі" (2001), Першы пленэр маладых мастакоў з Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ў літоўскім "Парку Еўропы" (1998), Сімпозіумы гранітнай скульптуры "Вільноя" (2000-я гады). У гэтых і шэрагу іншых тагачасных нагодах беларускія аўтары прымалі ўдзел на роўных з мастакамі краін Балтыі.

Сучасны этап узаемадзеяння па паўночным вектары характарызуецца інтэнсіфікацыяй творчых кантактаў, чаму спрыяюць арт-рэзідэнцыі, якія з'явіліся параўнальна нядаўна; павышэнне колькасці сімпозіумаў, а таксама сумесных выставачных і даследчых праектаў. Іх колькасць уражвае, згадаю толькі некаторыя: удзел беларускіх мастакоў у Балтыйскім трыенале міжнароднага мастацтва і Каўнаскім біенале, а галерэй "ЛаСандрарт" і "Ў" – у міжнародным кірмашы сучаснага мастацтва "ARTVILNIUS". Дарэчы, галерэя сучаснага мастацтва "Ў" у 2013 годзе зладзіла ажно чатыры літоўска-беларускія праекты (Кісялёва, 2013). Мастакі з поўначы складалі пераважную большасць замежных удзельнікаў Першага полацкага міжнароднага пленэру візуальных мастацтваў "ART-EGO" (2010) і Першага мінскага фестывалю мастацкага шкла "GlassНавігацыя" (2013). На фоне вялікай колькасці бягучых культурных ініцыятыў на паўночным напрамку я сфакусуюся на двух вялікіх праектах, якія добра ілюструюць сучасны стан заяўленага феномену, – на інстытуцыянальным і персанальным узроўнях.

"Дзверы адчыняюцца? Беларускае мастацтва сёння" куратарства Кястуціса Куйзінаса (Kęstutis Kuizinas), дырэктара віленскага Цэнтра сучаснага мастацтва, ствралася як экспазіцыя мастацкіх экзатычнасцей беларускай палітызаванай тэматыкі. Куратар акцэнтуе "місіянерскае" прызначэнне выстаўкі: "Магчыма, яна адкрые для ізаляванага і малавядомага для міжнароднай супольнасці беларускага мастацтва новыя каналы сувязі" (Куйзинас, 2010: 16). Аднак, каб знайсці працы дзеля ўвасаблення свайго куратарскага паслання з "аплоту тыраніі" (Куйзинас, 2010: 14), ён быў вымушаны запрасіць да ўдзелу мастакоў беларускага паходжання, што працуюць за межамі Беларусі, нібыта інтэграваных у сусветныя мастацкія трэнды. Нягледзячы на пэўныя штучнасць і дэкларатыўнасць, выстава з поспехам прайшла ў віленскім ЦСМ (2010) і варшаўскай "Захенце"(2011), рэпрэзентаваўшы шырокі пласт сучаснай незалежнай беларускай культуры – не толькі праз экспазіцыю, але і ў суправаджальных канцэртах, дыскусіях і творчых сустрэчах.

Іншы падыход прадэманстраваў Б'ёрн Норберг (Björn Norberg), куратар стакгольмскай "Mejan Labs" у "Праекце па абмене ў вобласці

мастацтва новых медыя паміж Беларуссю і Швецыяй” (2009). Яго мэтай было, відавочна, не толькі стварэнне “прадукту” (выставы), а арганізацыя даследчага праекту – так бы мовіць, “палявога даследавання” лакальнага беларускага мастацтва. Абраным праз Open call і сумоўе мастакам, якія працуюць унутры беларускіх межаў і кантэкстаў, была дадзена магчымасць міжкультурнай камунікацыі: сумесныя варкшопы і дыскусіі у Стакгольме. У выніку былі створаны праекты для фінальнай беларуска-шведскай выставы ў Мінску.[2] Яе экспазіцыя сталася вольнай мастакоўскай інтэрпрэтацыяй як айчыннай/інтэрнацыянальный тэматыкі, так і асобных аспектаў трансгранічных сацыяльна-культурных узаемадачыненняў.

Такім чынам, улічваючы вышэйзгаданае, можна канстатаваць, што на дадзены гістарычны момант супраца па паўночным вектары пачынае развівацца ў больш складаных і перспектыўных формах, чым абмен выставамі і індывідуальны ўдзел асобных творцаў у калектыўных праектах.

### ***Бібліяграфія***

1. Кісялёва, Валянціна (2013). “Пашырэнне арт-тэрыторыі”. *pARTisan – Альманах сучаснае беларускае культуры,* 07.01.2013, URL (доступ 15.01.2014): http://partisanmag.by/?p=9212

2. Куйзинас, Кястутис (2010). «Двери открываются? Белорусское искусство сегодня» in Julija Fomina and Kęstutis Kuizinas (eds), *Opening the Door? Belarusian Art Today.* Vilnius: Sapnu Sala: 13–17.

[2] Была паўторна экспанавана ў Полацку (2010).